Наш Магілёў

Грамадска-палітычная незалежная газета горада **№ 61(23), сакавік 2011 года**



Пятнаццаць гадоў таму ўпершыню ў незалежнай Беларусі адбыліся масавыя рэпрэсіі супраць мірных дэманстрантаў. Упершыню з'явіліся галадоўшчыкі, палітвязні і палітычныя ўцекачы.

Упершыню дэманстранты былі збітыя АМАПам, збітых проста пакінулі ляжаць на акрываўленым снезе.

З гэтага часу, кожны год нацыянальнае свята Беларусаў адзначаецца збіццём, затрыманнямі, арыштамі.

Але, нягледзячы на небяспеку быць збітым, застацца без працы ці вучобы, знаходзяцца людзі, якія збіраюцца разам, на мірныя акцыі для таго, каб паказаць, што Беларусь жыва і Беларускі народ не зламаны.

З надыходзячым святам, Беларусы!

Палітыкі застрашаныя. Замест мітынгу на Дзень Волі - ускладанне кветак

"Наша Ніва"

Арганізатары вулічнай акцыі на 25 Сакавіка абмеркавалі магчымыя сцэнары яе правядзення.

Нагадаем, што ў пятніцу Мінгарвыканкам адмовіў заяўнікам у шэсці і мітынгу ад плошчы Якуба Коласа да сквера Янкі Купалы. Быў прапанаваны мітынг без шэсця ў парку Дружбы народаў.

У панядзелак сітуацыі абмеркавалі прадстаўнікі Партыі БНФ, Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, кампаніі "Гавары праўду" і руху "Разам". Было вырашана, што ў аўторак будзе пададзеная скарга на рашэнне гарвыканкаму.

У цэлым жа, заяўнікі вырашылі кардынальна змяніць фармат акцыі. Яны будуць заклікаць людзей пасля працы прыходзіць у сквер Янкі Купалы, і ўскладаць кветкі да помніка паэту. Ніякага мітынга не будзе.

Большую прэс-канферэнцыю яны плануюць даць у аўторак а 13-й гадзіне на прыступках Маскоўскага суда, перад пачаткам працэсу над Змітром Дашкевічам і Эдуардам Лобавым.

Даведка

Дзень Волі - неафіцыйнае свята, якое адзначаецца 25 сакавіка часткай беларусаў і звязанае з абвяшчэннем у гэты дзень у 1918 незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (Трэцяя Устаўная грамата).

У 1919-39 гг. урачыста адзначалі ўгодкі абвяшчэння БНР у коле беларусаў, якія апынуліся на землях падуладных Польшчы (Заходняя Беларусь). Галоўныя ўрачыстасці адбываліся звычайна ў Вільні. Актыўны ўдзел у іх арганізацыі бралі прадстаўнікі БСГ і іншых арганізацый.

З пачаткам 1990-х гадоў у Мінску і іншых гарадах Беларусі праводзяцца палітычныя акцыі, мітынгі, шэсці, прысвечаныя гэтай даце. Гэтыя масавыя акцыі неаднаразова гвалтоўна перапыняліся міліцыяй, актывісты, што ўдзельнічалі ў іх, арыштоўваліся.

Сучасная форма назвы свята з'явілася ў апазіцыйным беларускім друку ў пач. 1990-х гадоў.

Адпаведнікам гэтага свята ў беларускай дыяспары ў ЗША з'яўляецца Дзень незалежнасці. Намаганнямі беларускіх арганізацый у ЗША пасля другой сусветнай вайны сенатары, губернатары і мэры адпаведных адм. адзінак неаднаразова абвяшчалі і праводзілі 25 сакавіка Беларускія дні ў шэрагу штатаў і гарадоў; неаднаразова праца Сенату і Кангрэсу ЗША пачыналася 25 сакавіка малітвай за Беларусь, чытанай беларускім святаром.







Тры кандыдаты
у Прэзідэнты Беларусі:
Уладзімір Някляеў
Андрэй Саннікаў
Мікола Статкевіч
Сустракаюць
Дзень Волі у турме КДБ

РЭДАКЦЫЙНАЯ ПОШТА



Сутыкнуліся з праблемай і не ведаеце да каго звярнуцца? Пішыце нам - мы паспрабуем дапамагчы Вам!

Магілёў, вул. Ленінская, 29, оф. 315,
e-mail: nash_mogilev@tut.by

Магілёўскія навіны ад Вітольда Няўрыды

У Магілёўскай абласной станцыі пералівання не хапае крыві

Пра гэта паведаміла газеце "Магілёўская праўда" загадчыца аддзялення абласной станцыі пералівання крыві Юлія Цішкоўская.

На яе думку адна з прычын, якая не спрыяе павелічэнню колькасці донараў - гэта адмена льгот на праезд у Магілёўскім гарадскім транспарце. Калі была гэтая льгота - пытанне з недахопам крыві не стаяла.

Юлія Цішкоўская адзначае, што магчыма сітуацыю здолее выправіць новы закон, паводле якога ў донары можна браць і замежных грамадзян, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі.

Тым часам медыкі вымушаны праводзіць разнастайныя акцыі па збору крыві сярод студэнтаў ВНУ, прадпрыемстваў гораду, ваеннаслужачых, МНС і міліцыі. Гэтыя акцыі дазваляюць знайсці новых донараў.

Старшыня магілёўскай донарскай арганізацыі "Кропля жыцця" Ігар Каваленка паведаміў "Еўрарадыё", што на працягу шмат год яго арганізацыя спрабавала прывіць культуру донарства многім людзям, аднак, аказалася, што чыноўнікам гэта непатрэбна.

"Па-першае - усе нашыя ідэі засталіся нерэалізаваныя з-за недальнабачнасці чыноўнікаў, а падругое - донары ў нас не ў пашане. Адсюль і праблема з недахопам крыві", - гаворыць Ігар Каваленка.

У Магілёўскім КДБ цягам трох дзён дапытвалі Крысціну Шацікаву

Актывістка грамадзянскай кампаніі "Наш Дом" Крысціна Шацікава была дапыта супрацоўнікамі вайсковай контрвыведкі. Нагодай для допытаў сталі падзеі, якія адбываліся 19 снежня ў Менску.

"Супрацоўнікаў контрвыведкі, якія назваліся Паўлам Траўрулькам і Максімам Мешчараковым зацікавілі фотаздымкі, якія я рабіла па Плошчы і бачыла тых людзей, якія білі вокны, - гаворыць Крысціна Шацікава, - З фотаздымкаў відаць, што вокны білі не дэманстранты, а невядомыя правакатары. У супрацоўнікаў контрвыведкі ёсць фота і відэаматэрыялы, дзе вокны і дзверы Дома Ўрада былі пабітыя і выламаныя, а як гэта ўсё пачыналася яны заснясць не паспелі і мае матэрыялы для іх аказаліся карыснымі".

Нягледзячы на тое, што Крысціна Шацікава раней перадала фотаздымкі ў Магілёўскае абласное КДБ і Першамайскі райаддзел міліцыі контрвыведчыкі аказаліся незадаволеныя допытам, які праводзілі іх магілёўскія калегі і вырашылі зрабіць яго самастойна.

Крысціна адзначае, што цягам першага дня допыту контрвыведчыкі паказвалі фотаздымкі і відэаматэрыялы, на якіх яна шукала гэтых правакатараў, а на другі дзень праходзіў следчы эксперымент каля магілёўскага Дома Саветаў, які вельмі падобны да Менскага Дома Ўрада. Пра кандыдатаў і апазіцыю ў яе нічога не запытвалі.

"Я паказала супрацоўнікам контрвыведкі дзе прыблізна хто з гэтых правакатараў стаяў і што рабіў. Пасля гэтага мы пайшлі зноўку ў будынак КДБ, каб занесці дадзеную мной інфармацыю ў пратакол", - гаворыць Крысціна Шацікава, - Усё гэта мы рабілі ў трэці дзень допыту.

Былыя назіральніцы выбарчага ўчастка №99, што ў Магілёве, атрымалі штрафы

Аб тым, што назіральніцы Ларыса Шукайла і Людміла Кавылкіна атрымалі штрафы яны дазналісь толькі 17 сакавіка, калі ім уручыў пад роспіс позвы судовы выканаўца.

Высветлілася, што кожная з іх аштрафавана на 525 тысяч рублёў.

Суд па іх справе адбыўся 31 студзеня, аднак, ніхога з іх не запрасілі на судовае пасяджэнне і аб яго выніках яны нічога не ведалі.

Нагодай для судовага разбіральніцтва стала тое, што жанчыны абвінавацілі старшыню выбарчай камісіі Ірыну Зямцову, у якой у той дзень нараджэння, у тым, што яна была ў нецвярозым стане. Апошняя прадставіла даведку з магілёўскага наркалагічнага дыспансера аб тым, што яна цвярозая і падала заяву ў міліцыю аб паклёпе.

Акрамя гэтага Ларысе Шукайла Ірына Зямцова прад'явіла пазоў на кампенсацыю маральнай страты у памеры 3 млн. рублёў, а Людміле Кавылкінай ў памеры 2 млн. Аб гэтым жанчыны дазналіся таксама ўчора.

Жанчыны збіраюцца абскарджваць пастанову аб адміністрацыйным штрафе ў Магілёўскім абласным суддзе.

Будаўнічы трэст №12 адтэрмінаваў высяленне больш за 100 жыхароў сваіх інтэрнатаў на год

Адпаведныя дамовы з жыхарамі гэтых інтэрнатаў на іх пражыванне былі перападпісаны з кіраўніцтвам трэсту №12 на год. А жыхарцы інтэрната па вул. Будаўнікоў, 7 Ірыне Мірановіч, якая вырашыла абскардзіць сваё высяленне праз суд - на паўгады.

"Не чакаючы суду, куды я падала сваю заяву, кіраўніцтва трэста прапанавала пажыць у інтэрнаце яшчэ паўгады, а пасля гэтага вызваліць памяшканне. Усім жа астатнім жыхарам пражыванне працягнулі на год. Гэта нейкая несправядлівасць і відаць, гэта звязана з маёй ініцыятыўнасцю па адстойванню правоў на пражыванне", - гаворыць Ірына Мірновіч.

Нагадаем, што нагодай для высялення з інтэрнатаў з'яўлялася тое, што гэтыя жыхары пражываюць у інтэрнатах трэсту на працягу менш 10 год і працуюць у прыватных будаўнічых фірмах.

Ініцыятыва выселіць такую колькасць чалавек з'явілася пасля таго, як у будаўнічым трэсце змянілася кіраўніцтва.

У Бабруйскім лесатэхнічным каледжы выказаліся за пашырэнне ўжывання беларускай мовы

17 студзеня, адбыўся педсавет выкладчыкаў каледжа, на якім разглядалася пытанне аб пашырэнні сферы ўжытку беларускай мовы.

На педсавеце зачытвалася радкі Францішка Багушэвіча "Не цурайцеся мовы беларускай, каб не ўмёрлі" і выказваліся за пашырэнне яе ўжывання.

Беларускамоўны выкладчык гэтага каледжу Юры Грынявецкі адзначыў, што педсавет адбываўся па разнарадцы з мясцовага гарвыканкама.

"На педсавеце я выказаўся за тое, каб мы прынялі пастанову з нагоды таго, каб пашырэнне ўжытку мовы пачалося з пераводу школаў на беларускую мову, быў створаны беларускі ўніверсітэт, - гаворыць Юры Грынявецкі, - аднак мая прапанова не знайшла падтрымкі прысутных. Напрыканцы, усе прысутныя прынялі рашэнне пашыраць ужыванне мовы ў каледжы, аднак, канкрэтных мерапрыемстваў для гэтага распрацавана не было".

Ці паставяць помнік Лукашэнкі ў Магілёве?

Магілёўцы дагэтуль не атрымалі пісьмовага адказу ад старшыні Магілёўскага аблвыканкама Пятра Рудніка на прапанову паставіць помнік Аляксандру Лукашэнка на цэнтральнай плошчы гораду, а саму плошчу Леніна перайменаваць у плошчу Лукашэнкі.

"Падчас мінулых прэзідэнцкіх выбараў некаторыя магілёўцы выказваліся за тое, каб усталяваць помнік Лукашэнка ў нашым горадзе, таму я вырашыў заняцца гэтым пытаннем і адправіў адпаведны ліст на імя старшыні аблвыканкама Пятра Рудніка, аднак, дагэтуль, не атрымаў ад яго ніякага адказу," - гаворыць ініцыятар звароту Аляксей Паўлоўскі.

Трэба адзначыць, што пад дадзеным зваротам падпісаласася 20 чалавек.

Магілёўскі незалежны прафсаюз РЭП праз суд вярнуў рабочаму працоўную кніжку і 2 400 тыс. рублёў

Прафсаюз радыёэлектроннай прамысловасці выйграў чарговую працоўную справу. Гэтым разам ён дамогся вяртання працоўнай кніжкі і грашовай сумы ў памеры 2 400 тысяч рублёў былому работніку ўнітарнага камунальнага рамонтна-эксплуатацыйнага прадпрыемства "Медык" Юрыю Канцавенка.

"Рабочаму не вярталі працоўную кніжку, - гаворыць юрыст прафсаюза РЭП Аляксей Яўгенаў, - а без яе ён не мог нікуды працаўладкавацца. Таму мы вырашылі адстаяць яго інтарэсы праз суд. Акрамя гэтага за затрымку выдачы працоўнай кніжкі рабочы атрымаў грашовую кампенсацыю ў памеры 2 400 тысяч рублёў, чым і застаўся вельмі задаволены".

Інспектар Радзевіч аформіў пратакол заднім чыслом

15 сакавіка магілёўская актывістка Наталля Шкадун атрымала па пошце ліст, у якім знаходзіўся пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні на яе непаўнагадовую дачку Ганну.

Нагодай для складання гэтага пратакола быў удзел Ганны, разам са сваёй маці і іншымі актывістамі "Маладога Фронту" у акцыі салідарнасці, якая адбылася 16 студзеня 2011 года.

"Хачу адзначыць, што ніякага пратаколу на маю дачку пры мне не складалася, - гаворыць Наталля Шкадун, - 2 сакавіка я прысутнічала пры апытанні маёй дачкі інспектарам Уладзімірам Радзевічам і ў маёй прысутнасці ён апытваў яе, але не складаў пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні".

Наталля адзначае, што там, дзе павінен стаяць подпіс асобы, на якую складаецца пратакол пазначана, што асоба ад подпісу адмовілася.

"З гэтай нагоды я збіраюся пісаць скаргі ў Пракуратуру і Магілёўскае абласное ўпраўленне ўнутраных справаў, бо фактычна гэта ёсць падробка пратакола", - гаворыць Наталля Шкадун.

Праваабаронца Барыс Бухель адзначае, што інспектар Радзевіч парушыў кодэкс аб адміністрацыйным правапарушэнні.

"Пісаць так пратаколы нельга - гэта падробка, якая будзе абскарджана намі ў абавязковым парадку. Вельмі проста даказаць, што пратакол складаўся не ў тым месцы, не ў той час і не з тымі сведкамі. Сяння гэты пратакол ужо несапраўдны, бо ўчора 15 сакавіка выйшаў двухмесячны тэрмін у які можна было прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці. Гэты інспектар альбо не ведае заканадаўства, альбо хацеў нейкім чынам выслужыцца", - гаворыць Барыс Бухель.

Скаргі апазіцыянераў на УКДБ Магілёўскай вобласці суд разгледзіць 21 сакавіка

21 сакавіка 2011 года суд Ленінскага раёна г.Магілёва разгледзіць скаргі актывіста ГА БНФ "Адраджэньне" Зміцера Салаўёва і актывісткі аргкамітэта партыі "Беларуская Хрысціянская дэмакратыя" Тацціяны Шамбалавай на Магілёўскае ўпраўленне КДБ.

Магілёўскія актывісты будуць абскарджваць пастаноўку іх на ўлік у КДБ і вынясенне ім пісьмовых папярэджванняў.

"Гэтых актывістаў магілёўскае КДБ паставіла на ўлік з-за таго, што яны прымалі ўдзел у мітынгу пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў у Менску 19 снежня 2010 года, - гаворыць праваабаронца Барыс Бухель, - а таксама за тое, што Тацціяна Шамбалава дзейнічае ад імя незарэгістраванай арганізацыі, а Зміцер Салаўёў неаднаразова прымаў удзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, якія, на думку супрацоўнікаў КДБ, маглі прывесці да масавых беспарадкаў".

Барыс Бухель адзначае, што пастаноўка актывістаў на ўлік у КДБ надае дадзенай структуры законнае права кантраляваць іх і сачыць за імі.

"Іх паставілі на ўлік незаконна, - гаворыць праваабаронца, - Па такіх артыкулах гэта можа рабіць альбо міліцыя, альбо пракуратару і тое пры наяўнасці пэўных умоваў, якіх па- просту няма. КДБ не надзелена такімі паўнамоцтвамі. Роўна год назад у такой сітуацыі аказаўся магілёўскі актывіст Мікола Расюк. Тады пастаноўка на ўлік у КДБ была абскарджана ў пракуратуры і апошняя адмяніла рашэнне КДБ, але гэтая справа Магілёўскае УКДБ нічаму не навучыла".

Праваабаронца спадзяецца на выйграш дадзеных справаў і падкрэслевае, што судзіцца з КДБ не страшна і гэта павінны бачыць звычайныя людзі, што і на гэтую страшную структуру можна знайсці ўправу.

Нагадаем, што суды адбудуцца 21 сакавіка ў 14-00 у судзе Ленінскага раёна г. Магілёва. Скаргу актывісткі Тацціяны Шамбалавай будзе разглядаць суддзя Трапыніна, а актывіста Зміцера Салаўёва суддзя Юрчанка. На думку Барыса Бухеля суды прызначаны ў адзін час, каб перашкодзіць праваабаронцам прысутнічаць адначасова на кожным з іх.

Авторитет или решение проблем

Егор Невменяемов

Окончательное политическое решение.

15 января 2008 г. на заседании Совета Безопасности Беларуси было принято "окончательное политическое решение" о строительстве АЭС. Спустя месяц, президент Александр Лукашенко сделал любопытные заявления о целях получения "мирного атома". Выступая перед студентами БГУ, он упомянул о "закрытых вещах", связанных с атомной энергией, которые добавят нашей стране независимости и полностью обеспечат наш суверенитет.

"О закрытых вещах я не хочу говорить в этой аудитории, но то, что строительство АЭС добавит нашей стране независимости, что это повысит нашу независимость, что это полностью обеспечит наш суверенитет - это сто процентов". На какие "закрытые вещи" намекал президент, остается только догадываться.

Среди основных доводов строительства АЭС А.Лукашенко назвал то, что "строительство современной, надежной атомной электростанции поможет гарантированно обеспечить страну более дешевой электроэнергией" и что "современные атомные электростанции на несколько порядков превосходят чернобыльскую АЭС по уровню надежности". Президент напомнил, что строительство АЭС позволит снизить потребность Беларуси в импортных энергоносителях почти на треть.

Под тихое шипение пузырьков шампанского.

15 марта 2011 г. по итогам заседания Совета министров Союзного государства между Беларусью и Россией под тихое шипение пузырьков шампанского был подписан ряд соглашений. Одно из которых - договор о сотрудничестве в строительстве белорусской АЭС. Этот документ подписали министр энергетики Беларуси Александр Озерец и генеральный директор государственной корпорации по атомной энергии "Росатом" Сергей Кириенко.

Отметим, что добро на подписание проекта соглашения с Россией о сотрудничестве в строительстве АЭС Александр Лукашенко дал только накануне, 14 марта. При этом, как сообщала президентская пресс-служба, проект соглашения был одобрен "с учетом изменений принципиального характера, внесенных в результате проведения переговоров с российской стороной". В подписании "атомного" соглашения на российских условиях эксперты видят то, что в политическом противостоянии Минска и Москвы белорусская сторона теряет позиции. Вследствие чего тревожное для местной номенклатуры укорение России в экономике Беларуси затормозить будет все сложнее.

Экономическая нецелесообразность.

На пресс-конференции в Минске руководитель энергетического отдела Гринпис России Владимир Чупров заявил, что ситуация, сложившаяся после радиационных аварий в Японии, дает белорусскому президенту возможность красиво выйти из затянувшейся игры в строительство АЭС, правила в которой все навязчивее диктует Россия.

По его словам, экономическая нецелесообразность строительства белорусской АЭС давно стала очевидной. Уже сейчас стоимость будущей станции оценивается в 9 миллиардов долларов. Это почти в два раза превышает цифры, изначально заложенные при обосновании проекта с точки зрения его рентабельности. Автоматически вырастает стоимость получаемой от АЭС энергии: вместо запланированных 4-5 центов один киловатт/час, по оценкам российских экспертов, уже "тянет" на 7-8.

- Это делает совершенно невозможными планы, согласно которым атомная станция позволит достичь 20-процентного снижения конечной цены электроэнергии на внутреннем рынке Беларуси, - сказал Чупров.

При этом эксперт считает, что цена БелАЭС будет увеличиваться. Он напомнил, что себестоимость строительства в атомной энергетике растет сегодня гораздо быстрее, чем в других секторах.

Идею обретения Беларусью энергетической независимости от России при помощи АЭС он также назвал наивной:

- Помимо возврата кредитов Беларусь должна будет отдавать России от 20 до 30 процентов с каждого киловатта за топливо, которое будет поставляться извне. Так что принципиально ничего не изменится, просто газовая зависимость сменится ядерной.



Коррупция "съест" около четырех миллиардов.

Из 9 миллиардов долларов, в которые оценивается стоимость строительства БелАЭС, около 4 миллиардов уйдет на "откаты", предупреждают российские эксперты.

Белорусская антиядерная кампания заявила о высоком риске коррупции при реализации проекта строительства белорусской АЭС российской госкорпорацией "Росатом". Накануне заседания Совета Министров Союзного государства в Минске были представлены доклады российских и международных организаций, исследовавших схемы работы российских атомщиков.

В результате анализа данных по закупкам "Росатома" международная группа "Экозащита!" и Трансперенси Интернешнл-Россия пришли к выводу, что в 40 процентах исследованных случаев были допущены нарушения, указывающие на возможность коррупции.

- При строительстве белорусской АЭС "Росатом" будет работать по тем же принципам, что и у себя на родине. Это означает, что при закупках могут быть применены отработанные в России коррупционные схемы, - заявил на пресс-конференции в Минске сопредседатель "Экозащиты!" Владимир Сливяк, - Если стоимость проекта белорусской АЭС составляет 9 млрд долларов, то по нашим оценкам, коррупция "съест" около четырех.

Представляя доклад об экономике российской ядерной электроэнергетики, подготовленный Объединением Беллона, российский физик-ядерщик Андрей Ожаровский, предупредил, что принцип открытой сметы, который активно пытается навязать Россия, может стать для Беларуси экономической ловушкой.

- Это говорит об уклонении от согласования конечной стоимости объекта. Я могу предсказать, что если сумма контракта не будет зафиксирована, то цена АЭС в процессе строительства существенно повысится. И это будет далеко не 9 млрд долларов, окончательная стоимость может оказаться на несколько миллиардов больше. Нечто похожее уже происходит в Финляндии при строительстве Олкилуото 3", - сказал он.

По словам экспертов, предположение о коррупционных рисках подтверждает тот факт, что проект белорусской АЭС реализуется непрозрачно, с нарушениями международных обязательств Беларуси, игнорированием технических норм и законодательства.

Вызывают настороженность также сжатые сроки, в которые планируется его осуществить. Напомним, что, как предполагается, собственная АЭС, состоящая из двух блоков суммарной мощностью 2 тысячи МВт, появится в Беларуси уже в 2016 году, когда будет введен в эксплуатацию первый блок станции. В то же время, по последним оценкам, требуется по меньшей мере 5 лет для того, чтобы создать правовую инфраструктуру для ядерной энергетической программы, от 2 до 10 лет - чтобы провести лицензирование, и около 5 лет - чтобы построить АЭС. Итого - не менее 15 лет до того момента, когда в стране, где ранее не существовало требуемой инфраструктуры, впервые сможет быть введена в эксплуатацию атомная электростанция. Если применить эту временную шкалу к Беларуси, то получается , что при благоприятных условиях станция сможет начать работу на ранее 2025 года.

Мнения ученых:

Строить атомную станцию не экологично и не экономично. И пока доля атомной энергетики в мире в ближайшие 10 лет будет неуклонно сокращаться, Беларусь делает ошибку, за которую расплачиваться придется и современникам и потомкам. Такое мнение высказал академик Российской Академии наук Алексей Яблакав, участвующий в общественной экологической экспертизе проекта строительства белорусского АЭС.

Энергетическое положение Беларуси не требует строительства атомной станции. Модернизация тепловых станций могла бы позволить несравнимо выгоднее, быстрее и дешевле не только обеспечить Беларусь электроэнергией, но и направлять ее в соседние страны. В принципе, атомная станция в энергетических целях не нужна", - такое мнение в интервью Еврорадио высказал белорусский физик, доктор технических наук, профессор Георгий Лепин.

Алексей Яблакав: "Есть технологии, которые пока что не используются, но уже разработаны, - низкотемпературной геотермальные. В каком угодно месте Земли можно просверлить дырку. На глубине в километр или два есть теплые породы в 100-150 градусов, закачивается вода либо, когда горячая вода есть, оттуда берется - и все! В каком угодно месте Земли - в Беларуси тоже! Это стоит в 4 раза дешевле, чем построить атомную станцию. И экологически приемлемо".

Как подчеркивает академик, Проектанты белорусской АЭС полностью игнорируют альтернативные источники энергии. Хотя сегодня развитые страны активно используют энергию ветра, солнца и другие альтернативные источники.

"Строительство белорусской АЭС - как ситуация в поезде: когда один хочет закурить, все другие против, а он берет и закуривает. "

Как сообщает BNS, Литва заявляет, что процесс оценки воздействия на окружающую среду (ОВОС) планирующейся к строительству в Беларуси АЭС не завершен и Вильнюс возражает против планов Беларуси построить АЭС в 50 км от литовской столицы.

Как заявляет литовская сторона - "Беларусь не провела ОВОС планирующейся к строительству в Беларуси АЭС в соответствии с общепринятыми нормами международного права, не организовала открытое обсуждение этого проекта в Литве и двусторонних литовско-белорусских консультаций, как того требует Конвенция Эспоо (Конвенция об оценке воздействия на окружающую среду в трансграничном контексте - ИФ).

Около 87% белорусов не верят в безопасность современных АЭС. Такие результаты получены в ходе голосования зрителей телеканала ОНТ в рамках ток-шоу "Выбор" в мае 2010 года.

Из вышесказанного смею сделать вывод, что строительство АЭС в Беларуси не столько решение энергетических вопросов в стране, а с одной стороны ребячество и позерство перед странами мирового сообщества, с другой дальнейшее укорение России в экономике Беларуси и возможность заработка для корпорации "Росатом".

Альтернативные *новости*

от Ольги Липкович

*** На белорусской АЭС будет установлен инновационный реактор на нефритовых стержнях.**
*** Президент Беларуси заявил, что Борис Немцов прислал в Минск 12 оппозиционеров. 2 уже осудили, значит, оставшиеся 10 могут разбить ваши стекла**
*** Государство готово продать свой пакет акций в МТС за $1 млрд. Хотели за 500 млн, но очень уж нужны деньги.**
*** "Белавиа" не беспокоит соседство с бюджетными авиаперевозчиками. Компанию вообще не беспокоит все, что происходит за пределами Беларуси.**
*** Автопроизводитель Шкода предложил Михалевичу стать ее новым рекламным лицом. Упор кампании будет сделан на комфорт и вместительные багажники**
*** После заявления Прокоповича о том, что девальвации не будет, 240 семей в Логойском р-не обменяли накопления в валюте и сделали вклады в рублях.**
*** Беларусь и Россия будут совместно экспортировать космические услуги. Белта уже извинилась за ошибку: буква 'с' в слове космические лишняя.**
*** Белорусы тратят на лекарства все больше денег. И это лишний раз показывает, как благодаря мудрой политике властей выросли доходы населения.**
*** Массовые акции повиновения вновь всколыхнули Беларусь.**
*** Для исполнения распоряжения президента о недопустимости дальнейшей жизни в долг, Нацбанк запросил у России кредит еще на 3 млрд долларов.**
*** Многовекторность внешней политики Беларуси означает, что при удачном стечении обстоятельств наша АЭС нагадит сразу и Польше и России и Литве.**
*** БРСМ планирует провести республиканский флеш-моб под девизом "Девальвация - это прикольно!"**
*** Грозит ли Беларуси вымирание пчел, возвращение ночных морозов. Эти и другие вопросы будут обсуждаться на экстренном заседании правительства.**
*** В "Приорбанке" не исключают девальвации рубля. Еще они Петкевич на работу не приняли.**
*** Книги писателя Чергинца являются исключением из правила о том что рукописи не горят.**
*** Власти Японии предлагают остановить торговлю валютой и акциями. Это традиционное решение для стран, пострадавших от атомных катастроф.**
*** Строительство АЭС - это еще один шаг по реализации программы президента "Белорусский народ будет жить плохо, но недолго".**
*** Президент будет внимательнее котролировать управление имуществом ОАО. После переборки картошки у него появилось больше свободного времени.**
*** Минский пивзавод Крыница обещает, что со следующего года начнет выпускать пиво.**
*** Уборщица, распространявшая слухи о девальвации, уволена с должности начальника отдела финансовой аналитики Нацбанка.**



Блогеры разожгли костер из книг Чергинца

БелаПАН

19 марта в Севастопольском сквере столицы состоялось празднование Дня защиты молодой белорусской нравственности. Участники литературно-художественной акции принесли с собой книги Николая Чергинца, из которых разожгли костер.

День защиты молодой белорусской нравственности празднуется во второй раз, отмечает организатор акции известный белорусский блогер Евгений Липкович.

- Молодая белорусская нравственность нуждается в защите, подобные мероприятия вообще должны стать ежедневными. Вот если встал утром, обнаружил где-то книги Чергинца, Рубинова, телевизор работающий с белорусским каналом... Не разбил телевизор, не сжег Чергинца - день прожит зря, нравственность пострадала, - считает Липкович.

Путин: Больше 6 млрд. долларов на АЭС Беларусь не получит

АФН

Россия может предоставить Беларуси кредит на строительство АЭС на сумму не более 6 млрд. долларов, заявил вчера премьер РФ Владимир Путин, отметив, что строительство сопутствующей инфраструктуры финансирует страна-заказчик АЭС.

"Объём кредита зависит от объёма того оборудования, которое страна-заказчик не производит сама. В случае с Белоруссией объём кредита составит примерно 6 млрд долларов. Это соглашение может быть заключено в течение месяца", - сказал Путин.

Власти Беларуси рассчитывают на кредит в 9 млрд. долларов, что позволит им осуществить на заемные средства строительство всей инфраструктуры.

"Вопрос идёт о финансировании инфраструктуры. Обычно страна-заказчик финансирует строительство инфраструктуры, прилегающей к станции самостоятельно. Мы с белорусскими партнёрами обсуждаем возможность участия российской стороны в кредитовании и этой части, но это - ещё раз хочу подчеркнуть - предмет переговоров. В целом мы готовы заключить это кредитное соглашение в течение месяца", - пояснил Путин.

Комментируя стоимость самой АЭС и сумму кредита на строительство станции, Путин привел примеры сотрудничества в сфере ядерной энергетики с другими странами.

"Мы строим, как вы знаете, атомные станции за границей и кредитуем эту работу. Допустим, для Китайской Народной Республики оформлен кредит 2,5 млрд долларов. Это действующая линия. Для Индии оформлен кредит 2,6 млрд. Это тоже действующая линия. Обсуждается (сейчас ведутся переговоры) открытия для Индии ещё одного кредита в 4 млрд долларов", - перечислил Путин.

У Гаазе зачыталі прывітаньне Сурвілы і падтрымалі беларускіх палітвязьняў

Радыё Свабода

У Гаазе каля будынку Міжнароднага суда прайшла акцыя салідарнасьці з палітычнымі зьняволенымі і ахвярамі рэпрэсій у Беларусі.

Пікет быў арганізаваны Фондам абароны дэмакратыі імя Тадэвуша Касьцюшкі і грамадзянскай ініцыятыве "Мы памятаем", пры ўдзеле актывістаў Беларуска-эўрапейскага Задзіночаньня. Да арганізатараў далучыліся і ўдзельнікі падзеяў на Плошчы Незалежнасьці ў Менску 19 сьнежня 2010 году.

Сябра Рады БНР Зьміцер Піменаў зачытаў віншаваньне старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы ў сувязі з 83-мі ўгодкамі Акту 25 сакавіка.

Дайджест от Яна Грылевича

Землетрясение магнитудой 8,9, происшедшее в Японии, привело к смещению оси вращения Земли почти на десять сантиметров.

Как сообщил Национальный институт геофизики и вулканологии Италии, сейсмические последствия оказались более серьезными, чем те, которые последовали за землетрясением на Суматре 2004 года. Тогда землетрясение привело к смещению земной оси на шесть сантиметров.

Итальянские сейсмологи считают, что в этом отношении последствия нынешнего стихийного бедствия уступают лишь влиянию самого сильного в истории наблюдений - Великого Чилийского землетрясения 1960 года, магнитуда которого, по разным оценкам, составляла от 9,3 до 9,5.

В Новой Зеландии начались съемки фильма "Хоббит"

В Новой Зеландии начались съемки фильма "Хоббит" - экранизации книги Джона Р.Р. Толкиена "Хоббит, или Туда и обратно". Об этом в понедельник, 21 марта, сообщает Associated Press. Режиссером картины является Питер Джексон.

"Хоббит" является приквелом к трилогии "Властелин колец", режиссером которой также был Джексон. Сообщается, что новая картина будет разделена на две части. Ожидается, что первая из них выйдет на экраны в конце 2012 года. Обе части будут сняты в 3D.

В "Бутырке" откроют тюремную синагогу

В московском следственном изоляторе номер 2 (СИЗО "Бутырка") в четверг, 24 марта, откроется синагога. Об этом сообщает агентство "Интерфакс" со ссылкой на пресс-службу Федерации еврейских общин России.

Планируется, что в течение 2011 года синагоги появятся еще в трех учреждениях ФСИН. Три синагоги уже работают в российских колониях. В июле 2010 года между ФСИН и ФЕОР было подписано соглашение о сотрудничестве, в соответствии с которым в исправительных учреждениях будет открыто не менее десяти синагог: их точное количество будет зависеть от числа иудеев, находящихся в заключении. Между тем, данных о том, сколько евреев отбывают наказание в российских тюрьмах или колониях, нет.

Наш Магілёў

Незалежнае грамадска - палітычнае выданне Горада
Выдавец Андрусь Волкаў, дырэктар Вітольд Няўрыда.
Надрукавана на ксераксе ў горадзе Магілёве. Наклад: 299 ас.
e-mail: nash_mogilev@tut.by